# МАДЭРН, НАДМАДЭРН І КАНСЕРВАТЫЎНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

**Пётра Рудкоўскі**[1]

**Abstract**

The article is an analytic reflection on doctrine of the New Right (*Nouvelle Droite*) as it is presented in works of its Belarusian followers. The author mainly concentrates on the critique of modernity by New Rightists and exposes overuse of figurative language to denigrate liberalism and evoke a feeling of moral catastrophe. Although the claim about ideological affinity of the New Right with Fascism is rather doubtful, there are – according to the author – solid reasons to treat it as a doctrine of the «closed society». Organicism, essentialism, ethnomysticism, soteriologic vision, sacralization of power – those elements, explicitly present in political philosophy of the *Nouvelle Droite,* witness about a tribalistic and anti-open-society character of this movement.

**Keywords:** New Right, modernity, conservative revolution, ethnic rebirth, closed society.

У гушчары розных *post*'аў – пост-мадэрнізм, пост-нацыянальнае, пост-хрысціянскае, пост-секулярнае ігд. – нялёгка, мабыць, заўважыць, што амаль побач жыве і развіваецца інтэлектуальна-культурная плынь, якую можна (уступна) ахарактарызаваць пры дапамозе сукупнасці слоў з прэфіксам *pre-*: прэ-мадэрнізм, прэ-нацыяналізм, прэ-хрыстыянізм, прэ-секулярызм. Гаворка ідзе пра «новую правіцу» (*Nouvelle Droite*, *New Right*), ідэі якой рэтранслююцца і распрацоўваюцца на айчынным грунце асяродкам «Крыўя», які аб'ядноўвае адносна невялікую, але даволі актыўную групу беларускіх (ці, дакладней, крыўскіх) інтэлектуалаў, мастакоў і музыкаў. У артыкуле прадстаўлю крытыку сучаснасці новымі правымі, затым паспрабую раскрыць іх асноўныя філасофскія перадпасылкі і аналітычна выдзеліць культурна-цывілізацыйныя пастулаты.

## 1. Крытыка сучаснасці з боку *новай правіцы*

Даволі сінтэтычны дыягназ сучаснасці можам знайсці ў канцэптуальным тэксце *Еўрапейская «новая правіца» і беларуская перспектыва*, які падпісаны імем Міколы Шкіранды. Дзеля патрэб далейшага аналізу ў цытаваны тэкст устаўлю нумарацыю.

---

[1] Пётра Рудкоўскі – магістар філязофіі (Ягелёнскі ўнівэрсытэт, г. Кракаў), магістар багаслоўя (Папская акадэмія навук, г. Кракаў), выкладчык ЭГУ (логіка, метады навуковага даследаваньня).

> «Палітычны і філасофскі рухі апошніх стагоддзяў ... характарызаваліся пяццю паралельнымі працэсамі: (1) індывідуалізацыяй праз разбурэнне належнасці да даўніх арганічных супольнасцяў; (2) масавізацыяй праз прыняцце стандардызаваных спосабаў жыцця і паводзінаў; (3) дэсакралізацыяй праз адыход ад рэлігійнага светагляду да навуковай інтэрпрэтацыі свету; (4) рацыяналізацыяй праз панаванне інструментальнага розуму, вольнага рынку і тэхнічнай эфектыўнасці; (5) універсалізацыяй праз планетарнае пашырэнне супольнасці, выдаванай за адзіную рацыянальна магчымую і таму найвышэйшую».[2]

Няцяжка заўважыць, што прыведзенае выказванне мае ў большай ступені ацэнкавы, чым апісальны характар. Індывідуалізацыя, масавізацыя, дэсакралізацыя, рацыяналізацыя, універсалізацыя – гэта, на думку Шкіранды, паталагічныя з’явы, якія падлягаюць выкараненню, а само сённяшняе грамадства патрабуе *аздараўлення*. Тэрапеўтычная метафорыка з’яўляецца даволі часта ў тэкстах новых правых. Аднак жа поруч з тэрапеўтычнымі часам даюць аб сабе знаць і сатэрыялагічна-містычныя матывы: *«адраджэнне духу праўдзівай Еўропы»*, дасягненне *«найвышэйшай ступені экзістэнцыі»*, вяртанне да *«жыццёвых энергій»*, адкрыццё і рытуалізацыя *«імператываў касмічнага парадку»*.

Праваднiком у працэсе гэтага вызвольнага вяртання з’яўляецца паганства. *«Паганства – гэта дыяметральная процілегласць разбэшчанасці і разбурэнню жыццёвых энергіяў, назіраных на сучасным Захадзе»*, – цытуе беларускі аўтар Гіёма Фая (Guillaume Faye), не забываючы пазначыць, што Фай кажа «цалкам справядліва». Дзеля таго, аднак, каб справядлівыя словы Фая былі ўспрыняты належным чынам, Шкіранда прыводзіць таксама словы гуру новаправага руху Алена дэ Бенуа (Alain de Benoist):

> «Мы, вядома, не секта, і мы ні ў якім разе не абвяшчаем “вяртання” да паганства. Але мы бачым у спрадвечным паганстве нашых дзядоў выяўленне шэрагу своеасаблівых каштоўнасцяў і духоўных пазіцыяў ды імкнёмся іх актуалізаваць, а не проста скапіяваць».[3]

Ітак, гаворка ідзе не проста пра «вяртанне», а пра *актуалізацыю* шэрагу «своеасаблівых каштоўнасцяў». На шляху да гэтай выратавальнай актуалізацыі стаяць два смяротныя ворагі – камунізм і лібералізм. Ад новых правых даведваемся, што абедзве гэтыя грамадска-палітычныя сістэмы з’яўляюцца «таталітарызмамі», і што яны хоць *«адрозныя ў прычынах і наступствах»* але аднолькава *«небяспечныя»*.

---

2 Шкіранда М. Еўрапейская «новая правіца» і беларуская перспектыва // *Druvis*. 2005. N 1. Раздз.: Крытыка сучаснасці. Цытаты тут і далей прыводзяцца паводле сеціўнай версіі http://kryuja.org/artykuly/druvis/novaja_pravica.html#20332.

3 Тамсама, як і цытата Фая.

«Таталітарызм на Усходзе занявольвае, пераследуе ды забівае целы, пакідаючы надзею. Таталітарызм на Захадзе стварае шчаслівых робатаў. Гэткі таталітарызм ёсць пеклам з кандыцыянерам, што забівае душу».[4]

Зноў Шкіранда цытуе дэ Бенуа і прызнае яму поўную рацыю. Гэтае выказванне галоўнага ідэолага новай правіцы з'яўляецца ці не самым эфектным у сваёй рытарычнай вытанчанасці (каларытныя вобразы *«пекла з кандыцыянерам»*, *«шчаслівыя робаты»*, паралелізм *«забівае целы – забівае душу»*), але адначасова ёсць, бадай, адным з самых дэмагагічных і пазбаўленых рацыянальнага зместу выказванняў. Лібералізм → пекла з кандыцыянерам → забойца душаў → таталітарызм – такі асацыятыўны ланцужок мог быць скляпаны толькі для патрэб маніпуляцыйнай прапаганды, але аніяк не дзеля філасофскай ці культуралагічнай экспертызы. Заўважма, што лібералізм («таталітарызм Захаду») тут прэзентуецца як нешта горшае за камунізм («таталітарызм Усходу»), бо па-першае, дзейнічае падспудна, «з кандыцыянерам», а па-другое, забівае душу (у той час як камунізм забівае ўсяго толькі целы). Зянон Пазьняк, помніцца, у сваёй крытыцы лібералізму абмежаваўся параўнаннем лібералізму да маньерызму ў гісторыі мастацтва.[5] Брава для Пазьняка-лібералa.

Радыкальны антылібералізм новых правых спалучаецца з не менш радыкальным антыамерыканізмам, што, зрэшты, няцяжка прадбачыць. *«Глыбінны падзел між ЗША і Еўропай мае гістарычнае, геапалітычнае, культурнае, метафізічнае абгрунтаванне, якое цягне за сабой гранічныя высновы»*, – кажа Шкіранда і чарговы раз падмацоўвае сваю думку цытаваннем дэ Бенуа:

«Цяпер мы адзначаем пяцьсот год адкрыцця Амерыкі, і, мяркую, ужо настаў час, каб пра яе забыць. Забыцца на Амерыку азначае вярнуць перспектыву ўкаранення ў часе, што нас істотна розніць ад Злучаных Штатаў з іх містыкай прасторы. ... Забыць пра Амерыку – значыць вярнуць усведамленне істы палітыкі, якой амерыканцы агулам не ведаюць, не цямяць, што палітыка – гэта не ёсць звычайны дадатак да маральнасці, права або эканомікі».[6]

І зноў нельга не аддаць даніны майстэрскаму стылю галоўнага ідэолага новаправых. Заўважаем тут метафізічную двойцу *«час – прастора»*, якая ў тэксце явіцца як эсэнцыяльная антыномія: арыентацыя на часавае вымярэнне Еўропы і арыентацыя на прасторавае вымярэнне ЗША сведчыць, маўляў, пра пераадольнае адрозненне гэтых двух культурна-цывілізацыйных фармаванняў. Няцяжка заўважыць і ацэнкавы аспект прыведзенага выказвання: час – гэта глыбіня, прастора – паверхня, у звязку з чым Еўропа – гэта

4 Шкіранда, op. cit.
5 Гл.: Пазьняк З. *Гутаркі з Антонам Шукялойцем.* Варшава: Беларускія ведамасьці; Вільня: Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, 2003.
6 Шкіранда, op. cit. Раздз.: Еўропа тысячы сцягоў.

абшар глыбокага (≈ якаснага, аўтэнтычнага), а ЗША – павярхоўнага (≈ бездухоўнага, фальшывага) жыцця. Поруч з метафізічным і аксіялагічным трэба заўважыць таксама дыягнастычны аспект выказвання, які мае даволі важкія практычныя імплікацыі: еўрапейцы, да той пары, пакуль вызнаюць ліберальную ідэалогію і падпарадкоўваюцца «свету быцця і мысленню амерыканцаў», жывуць «у духоўным рабстве». А ясна, што кожны нармальны чалавек павінен хацець выйсці з гэтага рабства.

Усялякая дактрына, якая змяшчае ў сабе імператыў «выйсця з рабства», павінна прадугледжваць таксама якуюсь візію «зямлі абяцанай», інакш кажучы, нейкі новы, больш якасны светапарадак (у глабальным або прынамсі ў лакальным маштабе). І такая візія прысутнічае ў вучэнні новых правых, пры тым, аднак, што яны не прадугледжаюць якогась «выхаду» і «прыходу» на кшталт біблейнай вандроўкі абранага народу. Абяцаную зямлю не трэба шукаць, не трэба нікуды ісці і вандраваць, бо гэта зямля знаходзіцца *тут*, у абсязе нашай актуальнай экзістэнцыі. Гамагенная, культурна замкнёная і ўнутрана іерархізаваная этнічная супольнасць – вось «абяцаная зямля» новых правых. *«Такім чынам* – піша Шкіранда – *менавіта гамагенныя еўрапейскія рэгіёны альбо* этніі – *Нармандыя, Брэтань, Каталонія, Галісія, Валія, Шатландыя, Баварыя, Галіччына, Жамойць, Латгалія ды г. д., а не дзяржавы нацыі (хоць яны могуць працягваць існаваць) будуць першаснымі элементамі новай Еўропы...».* І яшчэ, гэтым разам ужо непасрэдна пра наш беларускі дом:

> «Тутэйшасць вяртае кожнага беларуса да каранёў, да першапачаткаў, якія, у сваю чаргу, лучаць яго з еўрапейскім космасам».[7]

Цудоўная ідэя: вяртаемся да сваёй тутэйшасці, разуметай як *genius loci*, дух месца, боскі этнапачатак, каб спаткацца з Еўропай (дакл. «еўрапейскім космасам) на «глыбокім узроўні». Вяртанне да тутэйшасці – гэта ізаляцыя, якая вядзе да адкрытасці, адасабленне, якое становіцца спатканнем, замкнёнасць, якая дазваляе адшукаць міжэтнічную, а лепей: праэтнічную еднасць. Гэта ўжо не тая павярхоўная, сапсавананая прагматызмам ліберальная адкрытасць, не касмапалітычная, абездухоўленая еднасць, а еднасць і адкрытасць новай якасці, якая дазваляе перажаць – выкарыстоўваючы фразу Леві-Бруля – *participation mystique.*

У тэкстах новых правых знаходзім таксама і своеасблівы «метад» вяртання да этнічнай тутэйшасці: *«Найважнейшы фактар,* – піша Шкіранда, – *які мабілізуе волю людзей ды натхняе іх на дзеянні і адначасна выступае асновай ды пачаткам любой цывілізацыі, – гэта міф».*[8] Сам Ален дэ Бенуа падкрэслівае, што ў дачыненні да «старавечных веранняў» патрэбна *«не толькі*

---

[7] Шкіранда, op. cit. Раздз.: Еўропа тысячы сцягоў.

[8] Шкіранда, op. cit. Раздз.: Крытыка сучаснасці.

*эпістэмалагічнае спазнанне, а яшчэ і інтуітыўнае!*» А ў іншым месцы рашуча заяўляе пра першынство «характараў» і «хрыбтоў» перад «інтэлектам» і «мазгамі»: «*...наша эпоха ... патрабуе скарэй характараў, чым інтэлектаў, скарэй хрыбеінікаў, чым мазгоў*»[9]. Арыентацыя на міф, а не на навуковы дыскурс, давер інтуіцыі, а не «інструментальнаму розуму», стаўка на цвёрдых «хрыбетнікаў», а не на мяккіх інтэлектуалаў – вось што дапаможа нам вярнуцца і зжыцца навекі са сваёй спрадвечнай тутэйшасцю.

## 2. Інтэлектуальны эксперымент ці палітычная рэвалюцыя?

На базе вышэй сказанага можам цяпер выдзеліць асноўныя філасофска-палітычныя перадпасылкі новых правых:

• *Nouvelle Droite* з'яўляецца выразным прыхільнікам *арганіцызму*, перакананння, што чалавечая адзінка па сваёй прыродзе з'яўляецца часткай калектыўнага арганізму і якасць яе існавання залежыць ад ступені інтэграванасці ў арганізм і выконвання сцісла адведзенай ёй ролі;

• *калектыўны эсэнцыялізм* – перакананне, што існуюць чалавечыя супольнасці, якія надзелены сталай і нязменнай сутнасцю. Маральны абавязак людзей – трымацца гэтай сутнасці, а ў выпадку патрэбы – шукаць, адкрываць і вяртацца да яе. На думку новых правых, такой сутнасцю надзелены этнічныя супольнасці;

• *інтуітывізм* – перакананне, што «глыбокія ісціны» адкрываюцца не столькі пры дапамозе розуму, колькі інтуіцыі, а месцам аб'яўлення гэтых ісцінаў з'яўляецца не навуковы дыскурс, а міф.

З гэтых перадпасылак вырастаюць пэўныя маральныя, культурныя і геапалітычныя пастулаты. Абазначаць іх буду сігнатурай «анты-*X*», дзе «*X*» адносіцца да паасобных «негатыўных працэсаў», якія называе М. Шкіранда ў цытаваным на пачатку папярэняга параграфа выказванні.

*Анты-1:* адраджэнне этнасаў і субэтнасаў як натуральных асяроддзяў жыцця чалавека.

*Анты-2:* унутраная іерархізацыя этнічных супольнасцяў згодна з «трохчасткавай структурай»: святары-валадары – ваяры – вытворцы.

*Анты-3:* усталяванне сакральнага светаўспрымання: святасць космасу і этнічных духаў павінна прызнавацца ўсімі (хоць гэта не азначае абавязку верыць у асабовае існаванне духаў або багоў). Гэта азначае між іншым памяншэнне ролі навуковага дыскурсу на карысць этнічнай (або этнакасмічнай) міфалогіі.

*Анты-4:* рытуалізацыя і сакралізацыя асноўных сфер дзейнасці чалавека, у першую чаргу, улады і вайсковай службы.

*Анты-5:* імунізацыя этнасупольнасцяў перад уплывамі звонку, устанаўленне механізмаў прадухілення этнічнай гібрыдызацыі і вы-

---

9 Шкіранда, op. cit. Раздз.: Крытыка сучаснасці.

каранненне ўніверсалісцкіх, ліберальных і коспапалітычных ідэй як шкодных для жыцця гэтых супольнасцяў.

Праект, як бачым, даволі экзатычны. І тут выпадае паставіць пытанне: ці тут маем дачыненне выключна з інтэлектуальным эксперыментам, ці з палітычным праектам, які прэтэндуе – пры наяўнасці спрыяльных умоў – на быццё зрэалізаваным? Выкарыстоўваючы дыстынкцыю сацыёлага Ежага Шацкага: ці праект новых правых – гэта прыклад *эскапісцкай утопіі*, ці, хутчэй, экземпляр *рэвалюцыйнай утопіі*?[10]

Ёсць шэраг прычын, дзеля якіх прыходзіцца меркаваць, што новыя правыя – гэта не Томасы Морусы, не ўтапісты-летуценнікі, якія ўсяго толькі дзеля інтэлектуальнай забавы або культурнай правакацыі рысуюць утапічныя праекты, а рэвалюцыйна настроеныя паліт-інжынеры, якія вераць і спадзяюцца замяніць гэты сучасны, паталагічны свет светам звыш-сучасным (*Über-modern*, тэрмін П. Крэбса), здаровым і гарманічным. Новыя правыя – гэта *«рэвалюцыйны рух, які мае кансерватыўную ісцу»* – піша Шкіранда. На месцы цэнтралізаванай, бюракратычнай і тэхнакратычнай Еўропы, дэгенераванай ідэямі вольнага рынку, эгалітарызму і ўніверсалізму, павінна з'явіцца этнічная федэрацыя новага кшталту. *«Еўрапейскае федэральнае гаспадарства* (*Europäische Budesreich*), – чытаем далей у Шкіранды, – *зробіць магчымым звяз суверэнных народаў, супольнаю асноваю якіх будуць этнас, культура і гісторыя»*. Гэта будзе «Еўропа тысячы сцягоў», поліфанічная і шматстайная, дзе ажывуць правінцыйныя мовы, лакальныя культуры і спрадвечныя рэлігіі. Людзі абудзяцца з летаргу, у які іх увагнала хрысціянства і вырасшыя з яго ліберальна-ўніверсалісцкія дактрыны і здзівяцца, чаму так позна заўважылі, дзе месціцца іх самае што ні ёсць праўдзівае шчасце...

А што наконт Беларусі? Шкіранда піша:

> «Не зважаючы на тое, што рэгіяналізм у сучаснай Рэспубліцы Беларусь рэпрэсаваны вертыкаллю цэнтралісцкага аўтарытарызму, этнатэрытарыяльныя элементы беларускай нацыі мусяць адыграць ключавую ролю ў фармаванні нацыянальнай і еўрапейскай ідэнтычнасці».[11]

Аднак наўрад ці гэтыя элементы змогуць згуляць сваю «ключавую ролю» без рэвалюцыйных геапалітычныхператварэнняў, паколькі два асноўныя этнакультурныя арэалы – Крыўя і «даўняя Літва» разарваны дзяржаўнымі межамі. *«Вялікалітоўская традыцыя і культура немагчымыя без уз'яднання гістарычнай Літвы да скасавання недарэчнай мяжы між літоўскай і беларускай дзяржавамі»*. Што ж, даволі смелы, каб не сказаць шалёны праект. Але гэта яшчэ нішто ў параўнанні з планамі адносна

---

10 Гл.: Szacki J. *Spotkania z utopią.* Warszawa: Sic!, 2000. C. 11–12.

11 Шкіранда, op. cit. Раздз.: Еўропа тысячы сцягоў.

Крыўі: «*Існавання паўнавартаснай Крыўі не можа быць без земляў смаленскіх, пскоўскіх і цвярскіх крывічоў*», а таксама Палесся:

> «Гэтаксама і Заходняе Палессе не мае дастатковай магчымасці самавыяўлення ў варунках адлучанасці ад арганічна звязаных з гэтым краем украінскай Валыні ды польскага Падляшша».

Беларускія ідэолагі новай правіцы не маюць ілюзій наконт магчымасці здзяйснення «кансерватыўнай рэвалюцыі» пры цяперашняй уладзе: «*Пры ўсёй этычнай адрознасці рэжымы Пуціна і Лукашэнкі лучыць адна істотная ўласцівасць: інерцыйнасць, адсутнасць гістарычнай перспектывы, няздатнасць да творчасці*», – гэта словы расейскага нацыянал-рэвалюцыянера Аляксея Шырапаева, якія яго беларускі адпаведнік Аляксей Дзермант цытуе і аберуч падтрымлівае.[12] Аднак ёсць пэўныя спадзяванні на *interregnum*, які – на думку Шкіранды – неўзабаве завітае ў Беларусі.[13]

* * *

*Новая правіца*, як у Беларусі, так і за яе межамі, выклікае кантраверсіі і з'яўляецца аб'ектам розных – часам больш, часам менш апраўданых – абвінавачанняў. Абвінавачваецца яна, у прыватнасці, у ідэйным сваяцтве з (нэа)нацызмам і (нэа)фашызмам, ірацыяналізме, расізме, ксенафобіі, рэвалюцыйных памкненнях. У 1993 г. левацэнтрысцкая газета *Le Monde* апублікавала адкрыты зварот сарака еўрапескіх інтэлектуалаў і грамадскіх дзеячаў, у якім тыя заклікалі Еўропу «ўважліва сачыць за дзеяннямі ўльтраправых», маючы на ўвазе перадусім *Nouvelle Droite.* Роджэр Грыфін, вядомы спецыяліст па праблематыцы фашызму-нацызму, залічвае гэту плынь, хоць і з пэўнымі агаворкамі, да разнавіднасці фашызму.[14] Хваляць новую правіцу – у тым ліку і яе апаненты – за быццё «філасофіяй непрыемных ісцін», а менавіта за тое, што ў абшары гэтай ідэйнай плыні ўздымаюцца рэальныя праблемы сучаснай цывілізацыі, у першую чаргу еўраатлантычнай.

Правамоцнасць тэзы пра ідэйнае сваяцтва новай правіцы з фашызмам, нават у святле даследаванняў Роджэра Грыфіна, не з'яўляецца цалкам відавочнай. Новая правіца як ідэйна-культурная плынь існуе ўжо прынамсі сорак гадоў і цягам гэтага часу прайшла пэўную эвалюцыю і дыферэнцыяцыю. Напэўна метадалагічным грахом было б кваліфікаванне ўсяго гэтага накірунку *en bloc* як

---

12 Дзермант А. У чаканні Івана Жахлівага. Геапалітыка вачыма расейскіх азіятаў // *ARCHE*. 2006. № 9.

13 Шкіранда, op. cit. Эпілог.

14 Griffin R. Between metapolitics and apoliteia: the Nouvelle Droite's strategy for conserving the fascist vision in the 'interregnum' // *Modern & Contemporary France*. 2000. № 1; Griffin R. Interregnum or Endgame? Radical Right Thought in the 'Postfascist' Era // *The Journal of Political Ideologies*. 2000. July. Vol. 5, № 2. 2000.

фашыстоўскага альбо нават пара-фашыстоўскага. Гэтае пытанне патрабуе новых даследаванняў, што – па прычыне эмацыйнай нагружанасці прадмету – не ёсць такой простай справай.

Пакідаючы ўбаку пытанне пра ідэйнае сваяцтва новай правіцы з фашызмам, прыходзіцца, бадай, без засярог і агаворак сцвердзіць, што гэтая плынь явіцца як радыкальны праціўнік адкрытага грамадства. Арганіцызм, эсэнцыялізм, містыка тутэйшасці, утапізм, рэвалюцыйны імпэт, першынство «хрыбта» перад «мазгамі», тэрапеўтычна-сатэрыялагічная візія, пастулат каставай іерархізацыі грамадства, элітарызм, сакралізацыя ўлады, антыіндывідуалізм, няверʼе ў адзінства чалавечага роду – гэтых рысаў – так яскрава прысутных у ідэалогіі новых правых – больш чым дастакова, каб ідэальна ўпісвацца ў попераўскую характарыстыку замкнёнага грамадства.[15] І гэта, думаю, прычына, дзеля якой памянёны заклік еўрапейскіх інтэлектуалаў да пільнасці не варта трактаваць як капрыз «левакоў» альбо – як тое сугеруюць адвакаты новай правіцы – «наступ новай інквізіцыі».

[15] Пар.: Popper K. *The Open Society and Its Enemies.* Vol. I. Routledge, 2006. Ch. 10.